## Факт

### ПАЧАЛОСЯ ПАЛЯВАННЕ НА КАЗУЛЮ

**Адкрылася летняе паляванне на самцоў казулі, а таксама на селекцыйных жывёл любога полу і ўзросту.**



Паляваць можна па 30 верасня цягам сутак індывідуальным спосабам — з засады і з падыходу. Пры гэтым дазваляецца выкарыстоўваць наразную (з дульнай энергіяй кулі не больш за 1500 джоўляў), гладкаствольную (з патронамі з куляй ці карцечу) і кідальную (лукі і арбалеты) паляўнічую зброю. Для пошуку здабытых і здабычы параненых жывёл дапускаецца выкарыстанне паляўнічых сабак — выжлаў, спанiеляў, рэтрывераў, тэр'ераў і такс, а таксама іншых парод, якія маюць палявы дыплом па крывяным следзе.

За незаконную здабычу казулі можа быць прызначаны штраф, арышт, абмежаванне ці пазбаўленне волі тэрмінам да трох гадоў. Апроч таго, вінаваты можа пазбавіцца права займаць пэўныя пасады ці займацца пэўнай дзейнасцю. Падлягае выплаце і нанесеная прыродзе шкода: за адну асобіну казулі — 120 базавых велічынь, ці 25,2 мільёна рублёў.

**Сяргей РАСОЛЬКА.** *rs@zviazda.by*

### БІЛЕТЫ ВА УКРАІНУ — ДА 45 СУТАК

**Беларуская чыгунка павялічыла тэрміны продажу праязных дакументаў на цягнікі ў зносінах Беларусь — Украіна да 45 сутак, паведамілі ў прэс-службе магістралі.**

Для паляпшэння якасці абслугоўвання пасажыраў і прыцягнення дадатковага пасажырапатоку павялічаны тэрміны папярэдняга продажу праязных дакументаў з 30 да 45 сутак на некаторыя цягнікі, якія курсіруюць у зносінах з Украінай. Так, за 45 сутак да адпраўлення цягнікоў можна набыць білеты на цягнікі: 86/85 Мінск — Кіеў, 284/283 Баранавічы — Херсон, 371/372 Магілёў — Львоў. У прэс-службе нагадалі, што на цягнікі 94/93 Мінск — Адэса, 100/99 Мінск — Новааляксееўка глыбіня продажу праязных дакументаў засталася ранейшай і складае 45 сутак.

**Сяргей РАСОЛЬКА.** *rs@zviazda.by*

### ХТО ХОДЗІЦЬ РАНКАМ У МУЗЕЙ?

**18 мая з 10 да 14 гадзін у Музеі кнігі Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі (праспект Незалежнасці, 116, 3-ці паверх) адбудзецца мерапрыемства, прысвечанае Міжнароднаму дню музеяў.**

Цэнтральнай фігурай у святочнай праграме стане асоба беларускага першадрукара і асветніка Францыска Скарыны. Гэта будуць незвычайныя ўрокі для школьнікаў пад дэвізам «Хто ходзіць ранкам у музей, той робіць вельмі мудра!»

Дзятва будзе атрымліваць веды разам з новымі ўражаннямі. У праграму свята ўваходзяць занятки-гульні на выставе «Францыск Скарына і наш час», выстава-конкурс на арыгінальную размалёўку «Размалюй Францыска Скарыну», камандныя і індывідуальныя гульні-спаборніцтвы па складанні пазлаў «Складзі Францыска Скарыну», сустрэча з аўтарам кнігі «Францыск Скарына: чалавек-энцыклапедыя» Алесем Сушай і падпісанне паштовак з выявай першадрукара знаёмым і сябрам з усяго свету «Посткросінг з Францыскам Скарынам».

Мерапрыемства арганізавана Нацыянальнай бібліятэкай Беларусі сумесна з сярэдняй школай № 61 г. Мінска ў межах праекта "У госці да кніг".

**Надзея НІКАЛАЕВА.** *nikalaeva@zviazda.by*

### Прамая лінія

### Усё, што вы хацелі даведацца пра пенсіі

Ці павялічыцца перадпенсійны тэрмін, у якім працадаўца не мае права не падоўжыць вам кантракт? Як будуць плаціць пенсію тым, хто працаваў за мяжой? Калі будуць выходзіць на пенсію ваенныя і міліцыя? Якая выслуга гадоў зараз будзе патрэбна дзяржслужачым? На гэтыя і іншыя пытанні вам адкажуць **спецыялісты Міністэрства працы і сацыяльнай абароны Беларусі — начальнік упраўлення арганізацыі пенсійнага забеспячэння ДРОНАВА Алена Уладзіміраўна і кансультант упраўлення пенсійнага заканадаўства САМАДУМСКАЯ Аляксандра Віталеўна** — падчас «прамой лініі», якая адбудзецца ў «Звяздзе» **19 мая з 11.00 да 12.00.**

**Тэлефануйце: 8 (017) 287-18-71**

***Папярэднія пытанні (з пазнакай «Прамая лінія») можна дасылаць на электронны адрас info@zviazda.by або па пошце: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.***

### ДОЖДЖ І ДРЫЖЫКІ

**(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)**

У другой палове тыдня на тэрыторыю краіны завітае больш цёплая паветраная маса з Атлантыкі. У чацвер месцамі пройдуць кароткачасовыя дажджы, удзень магчымы навальніцы, уначы і раніцай у асобных раёнах прагназуецца туман. Тэмпература паветра ўначы складзе 2—7 цяпла, удзень — плюс 14—20 градусаў. Невялікія кароткачасовыя дажджы чакаюцца месцамі і ў пятніцу, калі ўдзень магчымы навальніцы. Стане цяплей нават уначы, калі чакаецца 3—9 цяпла, удзень — плюс 15—22 градусы.

А ў выхадныя дні чакаецца ўмерана цёплае, з кароткачасовымі дажджамі амаль камфортнае надвор'е. Тэмпература паветра ўначы будзе 4—11 цяпла, удзень — плюс 13—20 градусаў, па паўднёвым усходзе нават да 23 цяпла.

**Сяргей КУРКАЧ.** *kurkach@zviazda.by*

## Спорт-тайм

# НА МЯЖЫ ПРАВАЛУ

**Няўдалае выступленне хакеістаў на чэмпіянаце свету ў Піцеры, вяртанне Вікторыі Азаранкі ў ТОП-5 сусветнага рэйтынгу, чарговыя перамогі Меліцiны Станюты і вынікі 7-га тура чэмпіянату краіны па футболе. Пра самыя актуальныя спартыўныя падзеі раскажам у штотыднёвым спартыўным аглядзе «Звязды».**

**1. *Айчынныя хакеісты вельмі няўдала выступаюць на планетарным першынстве ў Расіі.*** Пасля трох пройгрышаў лідарам чэмпіянату наша зборная вырвала перамогу ў славакаў і, здавалася, вярнулася ў барацьбу за выхад у плэй-оф. Аднак пасля пайшлі паражэнні ад немцаў і аўтсайдараў групы — венграў. Адзначым, што хакеісты зборнай Венгрыі ўпершыню за 77 гадоў атрымалі перамогу на чэмпіянаце свету ў элітным дывізіёне. Такая гульня падапечных Дэйва Льюіса не толькі знішчыла шанцы на выхад з групы, але і паставіла каманду на мяжу вылету з вышэйшага дывізіёна, дзе беларуская зборная гуляе ўжо 12 гадоў.



*— Варатары і некаторыя гульцы павінны працаваць лепш,* — адзначае **галоўны трэнер зборнай Дэйв Льюіс**, *— мы павінны гуляць больш вынікова ў большасці. Так, я засмучаны. Наша абарона вельмі маладая, я з нецярпеннем і хваляваннем чакаў, як яны праявяць сябе, але, вядома, я імі не задаволены. Сёлета мы рыхтаваліся гэтак жа, як і летась, але цяпер нікога не здзівілі. Усе былі да нас гатовы, год таму было па-іншаму. Гэта цяжкі момант і для мяне, і для гульцоў, але нас не трэба шкадаваць, нам трэба вярнуцца да трэніровак і нарэшце даказаць, што мы можам,* — сказаў Льюіс.

Цяпер наш лёс залежыць не толькі ад сваёй гульні, але і ад гульні сапернікаў. Сёння беларуская зборная правядзе свой заключны матч на чэмпіянаце, нашым апанентам будзе каманда Францыі.

**2. *Меліцiна Станюта перамагла ў індывідуальным шматбор'і на Гран-пры Бухарэста па мастацкай гімнастыцы.*** Па выніках чатырох відаў праграмы (мяч, абруч, стужка, булавы) наша спартсменка набрала самую высокую суму балаў — 74,150. Другое месца заняла расіянка Арына Аверына, трэцяй стала яе сястра Дзіна Аверына. Другая беларуская гімнастка Кацярына Галкіна па выніках шматбор'я заняла пятае месца.

У фіналах асобных практыкаванняў Станюта тройчы ўздымалася на найвышэйшую прыступку п'едэстала: у практыкаваннях з абручом, мячом і стужкай.

Адзначым, што наступны этап Кубка свету пройдзе з 20 па 22 мая ў спартыўна-забаўляльным комплексе Falcon Club у Мінску.

**3. *Вікторыя Азаранка вярнулася на 5-е месца ў сусветным рэйтынгу.*** Першы радок па-ранейшаму займае амерыканка Серэна Уільямс, на другой пазіцыі Агнешка Радваньска з Польшчы, на трэцяй Ангеліка Кербер з Германіі.

Сотню самых лепшых тэнісістак планеты замыкае беларуска Аляксандра Сасновіч, а на 104-й пазіцыі знаходзіцца Вольга Гаварцова.

**4. *Адбыліся матчы 7-га тура чэмпіянату краіны па футболе.*** Мінскае «Дынама» згуляла ўнічыю з «Гранітам», сталічныя футбалісты змаглі выратаваць матч толькі на другой кампенсаванай хвіліне — 1:1. Гродзенскі «Нёман» на сваім полі мінімальна саступіў барысаўскаму БАТЭ — 0:1. Наваполацкі «Нафтан» стаў мацнейшым за «Слуцк» — 1:0, а «Славія» ў Мазыры буйна перамагла «Мінск» — 6:2. Салігорскі «Шахцёр» саступіў дэбютанту турніру «Крумкачам» — 0:2, а «Гарадзея» «Віцебску» — 0:2, у матчы «Іслачы» і «Белшыны» мацнейшымі аказаліся футбалісты з Бабруйска — 3:2.

Яшчэ адна сустрэча 7-га тура паміж брэсцкім «Дынама» і жодзінскім «Тарпеда-БелАЗ» пройдзе 30 мая. Першыя тры радкі ў турнірнай табліцы зараз за барысаўскім БАТЭ — 19 ачкоў, «Іслачу» — 13 балаў і «Тарпеда-БелАЗ» — 11.

**5. *Баскетбалісты «Цмокі-Мінск» заваявалі «золата» чэмпіянату Беларусі, «усухую» абыграўшы ў фінальнай серыі сапернікаў з «Гродна-93» — 3:0.***

Мінчане спачатку двойчы абыгралі гродзенскую дружыну на яе пляцоўцы — 111:85 і 100:60, а ў трэцім паядынку ў сябе дома ўзялі верх з лікам 100:84. Для «драконаў» гэта сёмы запар і восьмы ў гісторыі чэмпіёнскі тытул.

Па выніках фінальнай серыі самым каштоўным яе гульцом прызнаны амерыканскі легіянер чэмпіёнаў Джасцін Грэй.

**6. *Гандбалісткі «Гомеля» выйшлі наперад у фінальнай серыі чэмпіянату Беларусі з мінскім «БНТУ-БелАЗ» — 2:1.***

Пасля хатняга паражэння ад дзейных чэмпіёнак з лікам 23:24 гамяльчанкі ў гэтыя выхадныя атрымалі дзве перамогі. Чацвёрты паядынак серыі да трох перамог адбудзецца 21 мая ў Гомелі. Адзначым, што ў выпадку поспеху падапечныя Томажа Чатэра (гамяльчанкі) упершыню ў сваёй гісторыі станушь чэмпіёнкамі Беларусі.

**Дар'я ЛАБАЖЭВІЧ.** *lobazhevich@zviazda.by*

## Літаратурныя сувязі

# «Нам застаецца доўжыць эстафету»

**Амантай Ахетаў — паэт, празаік, публіцыст, літаратуразнаўца. Старшы эксперт Інстытута літаратуры і мастацтва імя М.А. Аўэзава (Казахстан, Алматы), часты аўтар беларускага інтэрнэт-партала «Сугучча: літаратура і публіцыстыка краін СНД». (sozvuchie.by) характарызуе сённяшні стан беларуска-казахскіх літаратурных стасункаў.**

***— Як вы асабіста ацэньваеце сучасны працэс беларуска-казахскіх зносін у галіне літаратуры?***

— Культурныя сувязі паміж нашымі народамі пачаліся яшчэ ў XIX стагоддзі і ўмацаваліся ў савецкі перыяд. Асабліва ў час асваення цаліны, калі ўзніклі новыя саўгасы з пасланцаў братэрскай рэспублікі. Асаблівым этапам быў і час Вялікай Айчыннай, з якой прынеслі свае творы і казахскія пісьменнікі-франтавікі Адзі Шарыпаў, Жубан Малдагаліеў, Сагінгалі Сеітаў, якія змагаліся з фашыстамі ў Беларусі. У сваіх вершах, у сваёй прозе яны перадалі, рэльефна паказалі мужнасць, пакуты беларускага народа, вызваліцеляў Беларусі.

Нам застаецца пераняць гэту эстафету дружбы і пазнаёміць чытачоў нашых краін з новымі плынямі нашых сучасных нацыянальных літаратур. Паказаць аблічча новага часу ў прачытанні казахскіх і беларускіх літаратараў. Добры пачатак пакладзены на беларускім партале «Сугучча», многія старонкі якога прысвечаны казахскай літаратуры.

***— Які аспект гістарычнага характару, на ваш погляд, павінен быць больш шырока раскрыты ў прадстаўленні казахскай літаратуры ў Беларусі?***

— У першай палове XIX стагоддзя ў высылку на казахскія землі за рэвалюцыйныя погляды былі асуджаны многія прадстаўнікі інтэлігенцыі з Беларусі. Сярод іх — і сябра вялікага польскага паэта Адама Міцкевіча Адольф Янушкевіч, які пакінуў нашчадкам успаміны пра жыццё казахаў.

У яго лістах з казахскага стэпу ёсць такія выдатныя радкі пра наш народ: «Некалькі дзён таму буў сведкам сутыкнення паміж дзвюма варожымі партыямі і са здзіўленнем пляскаў у далоні, слухаючы аратараў, якія ніколі не сутыкаліся з прозвішчамі Дэмасфена і Цыцэрона. А сёння перада мною выступаюць паэты, якія не ўмеюць ні чытаць, ні пісаць, аднак здзіўляюць, уражваюць мяне сваімі талентамі, бо песні іх так шмат гавораць маёй душы і сэрцу».

Далей Янушкевіч з не меншай узнёсласцю піша аб праведзенні тоя сярод казахаў, аб доглядзе коней, прыгатаванні кумысу, праведзенні айтыс акынаў, абрадзе сватання, вылучэнні спадчыны, пахавальных рытуалах... З горыччу піша пра ўсёдазволенасць царскіх чыноўнікаў, грубым стаўленні і збіванні камчой, параненні безвінных, за што ў народзе аднаго з такіх чыноўнікаў празвалі «Камча маёр». Таму варты ўдзячнасці выказаныя вучоным словы: «Надышоў час, калі качэўнікі павінны заняць годнае месца сярод народаў, якія зараз пазіраюць на іх з вялікай пагардай».

І вось гэты час надышоў. Казахстан стаў незалежнай дзяржавай. Але сувязь з беларускім народам не абарвалася. Нашы краіны ўвайшлі ў адзіны Еўразійскі саюз.

***— Якія формы супольніцтва паміж пісьменніцкай грамадскасцю Казахстана і Беларусі ў галіне мастацкага перакладу вы прапанавалі б рэалізаваць у першую чаргу?***

— Мне прыемна адзначыць, што ў апошнія гады менавіта беларускі бок стаў ініцыятарам выдання перакладаў сучасных казахскіх пісьменнікаў і паэтаў у кнізе «Не ведаючы межаў» серыі «Сугучча сэрцаў», у часопісах «Нёман», «Полымя», «Маладосць», газеце «Літаратура і мастацтва»...

***— У «Літаратуры і мастацтве» надрукаваны і пераклад вашага апавядання...***

— І я вельмі ўдзячны за гэта. Спадзяюся, што гэтая публікацыя — не апошняя мая сустрэча з беларускім чытачом... Уважлівая да тэмы Казахстана і газета «Звязда» з яе дадаткам «Союз Евразия». Ведаю, што беларускія журналісты, пісьменнікі пісалі на іх старонках і пра Алжаса Сулейменава, і пра Немата Келімбетава, і пра Святлану Ананьеву, роля якой у развіцці беларуска-казахскіх літаратурных сувязяў неверагодна высокая.

Канешне ж, хацелася б, каб і іншыя выдавецтвы нашых краін знаходзілі месца ў сваіх планах для перакладной літаратуры. Чаму б не выдаць, напрыклад, анталогію сучаснай беларускай паэзіі на казахскую?..

***— Ці існуюць сёння ў Беларусі і Казахстане магчымасці для шырокага развіцця работы ў галіне параўнальнага літаратуразнаўства? І ці ёсць увогуле запатрабаванасць такога роду практыкі?***

— Такія даследаванні літаратурных працэсаў вядуцца пастаянна. Але пра шырокую запатрабаванасць гаварыць пакуль што рана. Спярша трэба стварыць дастатковую базу перакладаў хоць бы па галоўных кірунках нацыянальных літаратур.

**Сяргей ШЫЧКО,**

*Алматы — Мінск*